**Станкевіч, Н.** За прычыненай дзверцай – новае жыццё / Н. Станкевіч // Міёрскія навіны. — 2014. — 18 студз. — С. 4.

## ЗА ПРЫЧЫНЕНАЙ ДЗВЕРЦАЙ – НОВАЕ ЖЫЦЦЁ




**На вайне людзі гінуць. Пра гэта ведаюць нават маленькія дзеці. Але большасць з нас – толькі тэарэтычна. Тых, каму выпала ўласнымі вачыма ўпэўніцца ў бясспрэчнасці трагічнай аксіёмы, на шчасце, у наш час не так шмат. Яшчэ менш непасрэдных удзельнікаў ракавых паядынкаў са смерцю, дзе вынік, здавалася б, прадвызначаны. Але, як паказвае жыццё, нават у такога непрадказальнага і ўсемагутнага саперніка здараецца ўзяць рэвашн.**

**Івану Юхно, былому воіну-інтэрнацыяналісту, гэта ўдалося. Паўтара года ён правёў у гарачым пекле вайны на спякотнай зямлі Афганістана. Бачыў усё – геройства і страх, радасць і боль, пакуты і смерць. Перад тым, як дэмабілізавацца, ледзьве не загінуў. Але ўсё ж аказаўся шчаслівчыкам, у «кашулі нарадзіўся».**

### Служыць, як усе

Родам Іван з гарадскога пасёлка Лынтупы, што ў Пастаўскім раёне. Там прайшло яго маленства і юнацтва. Рос адзіным дзіцём у сям'і. Шэсць гадоў было хлопчыку, калі трагічна загінуў бацька. Маці падымала яго адна. Вось таму, атрымаўшы атэстат аб васьмігадовай адукацыі, хлопец пайшоў працаваць. Работа па душы знайшлася ў будаўнічай арганізацыі ў Літве, да якой ад дома рукой падаць, і адначасова вучыўся ў вячэрняй школе. Перад прызывам у армію закончыў курсы ДТСААФ і атрымаў спецыяльнасць вадзіцеля. У 1986 годзе яму ўручылі павестку.

Расказвае Іван, што на вайну трапіў, як усе. «Прызыў, вучэбка і адпраўка ў далёкую краіну». Сам, як і многія іншыя, напісаў заяву, што хоча ў Афганістан. Хаця меў поўнае права служыць у Савецкім Саюзе, бо маці заставаўся год да пенсіі і была магчымасць хутка дэмабілізавацца дадому. Аднак хлопец, як і ўсе маладыя, імкнуўся абараняць паўднёвыя рубяжы нашай Радзімы. Хацелася найхутчэй дабрацца да пункта прызначэння. Прываблівала хвалюючая невядомасць, была юнацкая рашучасць і ніякага разумення, што такое сапраўдная вайна. Хаця дзесьці ў глыбіні душы закрадвалася трывога.

### Вучэбка

Службу Іван пачынаў у горадзе Фергана, што ва Узбекістане. Першыя паўгода прайшлі ў вучэбным корпусе.

– Гэты перыяд запомніўся як самы складаны і вельмі жорсткі, – узгадвае Іван Юзэфавіч. – Спецпадрыхтоўка страявая, агнявая, фізічная – адны заняткі і трэніроўкі. Нас дрэсіравалі да знямогі, дабіваючыся выдатнай ваеннай загартоўкі. Мы скакалі з парашутам, бегалі ў спёку на

дыстанцыю 24 кіламетры ў поўнай экіпіроўцы: бронік, аўтамат-РГД, рукзак дэсантніка з друзам належнай вагі. Нагрузка не для слабакоў, усе салдаты тады скінулі па 10–15 кілаграмаў. Але трымаліся стойка і ніхто не скардзіўся, бо ведалі, што прызваны выконваць інтэрнацыянальны абавязак і бездакорна падпарадкоўваліся загадам камандзіраў.

**Экстрэмальныя маршруты**

Пасля падрыхтаваных воінаў накіравалі ў Афганістан. Службу Іван Юхно пачаў у Кабуле ў 350-ым палку ВДВ 103 паветрана-дэсантнай дэвізіі, што стаяла ля аэрадрома. Спачатку быў аўтаматчыкам, затым вадзіцелем. Першым прыняў ад дэмбеля ЗІЛ-130, а праз год сеў за руль «Урала-4320».

Аб’ездзіў Афганістан уздоўж і ўпоперак. Пастаяннай справай было суправаджэнне калон з гаспадарчымі, харчовымі грузамі для арміі і афганскага народу. На шляху нярэдка ўспыхвалі кровапралітныя сутычкі. У адной з такіх Іван Юхно атрымаў раненне. Да дэмбеля заставалася ўсяго паўтара месяца.

– Калона рухалася на Кандагар, – узгадвае былы афганец. – Ноччу, калі прыпыніліся на адпачынак, нас пачалі абстрэльваць з гранатамётаў. Я перацягнуў затвор аўтамата і выскачыў з машыны, у той момант у салон трапіла граната. Паспеў закрыць браніраваныя дзверцы, гэта і выратавала жыццё. «Урал» згарэў.

Апошнія дні службы прайшлі на шпітальным ложку. Была кантузія, асколкавыя раненні. Мноства дробных часцінак глыбока ўвайшлі ў цела і дагэтуль там застаюцца. Самы вялікі асколак трапіў у нагу, але ўсё абышлося без страшных наступстваў.

**Аглядаючыся назад**

Дваццаць пяць гадоў прайшло пасля вываду савецкага войска з Афганістана, ды амаль столькі ж пасля тых незабыўных баявых дзён, калі нявопытным, «зялёным» юнаком, выконваў свой інтэрнацыянальны абавязак Іван Юхно. 15 лютага – асаблівы дзень каляндара, калі збіраюцца воіны, пра якіх з гордасцю гавораць «афганцы», каб ушанаваць памяць загінуўшых, успомніць баявых сяброў. Некаторыя саслужыўцы знашліся на сайце «Аднакласнікі», з імі ёсць пра што пагаварыць.

Цяпер афганец адзначае, што служба была няпростай і адначасова цікавай. Побач хлопцы з розных куткоў Савецкага Саюза. Складваліся ўсялякія стасункі, але стараліся дапамагаць адзін аднаму, інакш ва ўмовах вайны выжыць немагчыма. Няпроста было прыстасавацца да клімату, калі днём у гарах спякота невыносная, а ноччу зуб на зуб не трапляе. З цікавасцю назіралі за бытам і жыццём мясцовых жыхароў. Адносіны з імі падтрымліваліся добрыя, але нярэдка здаралася так, што днём яны – сябры, а ноччу – ворагі са зброяй у руках.

– Ці страшна было? – пытаюся ў воіна-афганца.

– У пару маладосці ні пра што не думалася. Калі выходзілі ў рэйды, з’яўляўся нейкі азарт. А вось калі бачылі, як узляталі ўвысь адзін за адным самалёты з траурнай чорнай паласой, на борце якіх перапраўлялі труны з загінуўшымі воінамі, з’яўляліся нервовы мандраж і боль..., – з горыччу адзначыў Іван Юзэфавіч.

Былы афганец узнагароджаны медалём «За адвагу», ордэнам Чырвонай Зоркі. З яго слоў, усялякае здаралася ў жыцці, але такіх псіхалагічных і фізічных нагрузак, якія давялося адчуць у Афганістане, не было. Ён вытрымаў, не сарваўся, знайшоў сваё месца ў жыцці. Дэмабілізаваўшыся, падаўся на радзіму. Працягваў працаваць на будаўнічым прадпрыемстве ў Літве. Лёс падарыў яму сустрэчу з Людмілай, якая прыехала па размеркаванні таваразнаўцай у Паставы. Пажаніліся. Нейкі час жылі ў Літве, але пасля распаду Саюза, у 90-х гадах, вырашылі падацца на Міёршчыну, адкуль родам другая палавінка Івана.

Сям’я атабарылся ў райцэнтры. Абзавялася ўласным домам па вуліцы Піянерскай. Галава сям'і ўжо шмат гадоў працуе бетоншчыкам у ПМК-55, а яго палавінка Людміла Чаславаўна – эканамістам на хлебазаводзе. Сын ужо дарослы, жыве ў Віцебску. На пытанне, ці хацеў бы бацька, каб ён прайшоў падобную школу загартоўкі і мужнасці, Іван Юзэфавіч адказаў:

– Наогул, канешне ж, менавіта ў арміі я спазнаў кошт жыццю, усвядоміў, што такое сапраўдная дружба. Напэўна, мне пашанцавала, што я служыў у такіх няпростых умовах, але няхай падобная служба застанецца гісторыяй для нашых дзяцей.

***Наталія Станкевіч***